Падтрымай "Вясну" на PATREON

У Беларусі працягваюць выносіць папярэджанні пікетоўшчыкам-вылучэнцам

21.09.2019 **Тэгі**: выбары-2019



Вылучэнцу ў кандыдаты ад незарэгістраванай партыі Народная Грамада Андрэю Пуканаву, які зарэгістраваў ініцыятыўную групу і збірае подпісы выбаршчыкаў 21 верасня выбарчая камісія Гомельскай-Прамысловай выбарчай акругі №35 вынесла папярэджанне. Пра гэты інцыдэнт піша "Гомельская Вясна".

Па інфармацыі назіральніка кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары” **Леаніда Судаленкі**, фармальнай падставай для такога рашэння з’явілася інфармацыя ад РАУС Цэнтральнага раёна г. Гомеля аб тым, што Пуканаў пад час пікету па зборы подпісаў выкарыстоўваў стэнды з надпісам "Лукашэнка павінен сыйсці". Сам вылучэнец на паседжанне камісіі не з’явіўся, хаця па агучанай сакратаром камісіі інфармацыі, яна асабіста запрашала яго на паседжанне.

Па словах назіральніка, яму далі магчымасць азнаёміцца з лістом міліцыі ў акружную камісію. Ніякіх прапаноў праваахоўнікі не выказвалі, яны проста інфармавалі камісію аб тым, што адбылося. У лісце таксама пазначана, што грамадскі парадак падчас пікету не парушаны.

Старшыня АВК №35 **Ала Андрушчанка** спрабавала давесці, што размова ідзе не пра тое, што Пуканаў нешта парушыў, а што трэба выконваць выбарчае заканадаўства. Сябрам камісіі быў прадэманстраваны стэнд з пікету. Яна падкрэсліла, што інфармацыя на стэндзе ўтрымлівала перадвыбарчую агітацыю, якая паводле заканадаўства магчыма толькі пасля рэгістрацыі кандыдатаў. Яна ж прапанавала вынесці прэтэндэнту папярэджанне. Другіх прапаноў не паступіла. На паседжанні прысутнічалі 10 з 13 сябраў акружкама, кворум быў. Галасавалі за папярэджанне адзінагалосна.

Раней за надпіс на стэндзе "Лукашэнка павінен сыйсці" падчас збору подпісаў былі вынесены папярэджанні актывістам "Народнай Грамады" і АГП:

- У Мінску 16 верасня — **Валянціну Троцкаму;**
- У Барысаве 19 верасня — **Аляксандру Абрамовічу;**
- У Гомелі 20 верасня — **Уладзіміру Няпомняшчых.**


“Праваабаронцы за свабодныя выбары”

Навіны кампаніі ў фэйсбуку, твітэры і на Тэлеграм-канале.

Твитнуть







"Беларусі пахваліцца няма чым". У Вене прайшла кансультацыя пра мірныя пратэсты


Герб на акне, Курапаты і дзесяцігадовы малюнак. Тры справы супраць Беларусі, зарэгістраваныя ў КПЧ ААН

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Кніга ў зняволенні – гэта больш чым кніга": што чытаюць беларусы ў СІЗА і калоніях?


У палітвязня ў турме здарыўся інфаркт і інсульт. Яго адправілі ў калонію

"А ў чым мне прызнаваць віну?" Гісторыя палітвязня з чырвонай біркай

Палітзняволеную Вікторыю Кульшу ў зарэчанскай калоніі збіваў і душыў наглядчык



ГАЛОЎНАЕ







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Я не асуджаная, я ў палоне". Маналог Алены Лысковіч — былой палітзняволенай пасля "хіміі"

Жанчыну асудзілі на 1,5 года калоніі за ўдзел у Маршах

"Гэта атрад АМАП "пережестил": як у Бабруйску пераследавалі мужчыну з інваліднасцю

Палітзняволеную Яну Пінчук, якую экстрадавалі з Расіі, асудзілі да 12 гадоў калоніі

У Варшаве адбылася прэзентацыя інсталяцыі "1525", прысвечанай беларускім палітвязням (фота)

Шэсць гадоў калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму прысудзілі айцішніку з Брэста

Праграміста Аляксандра Лагуту асудзілі да двух з паловай гадоў "хіміі" за "паклёп" на Лукашэнку

Ціск на палітвязняў, папаўненне ў "спісе экстрэмістаў": хроніка пераследу 3-5 чэрвеня


Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Травень 2023

За распаўсюджванне экстрэмісцкіх матэрыялаў і абразу Лукашэнку асудзілі жыхара Ліды

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Травень 2023







ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY